(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

УДК [348:271.2(470+571)]:[348:272]“1863–1905”

**Грахоцкі**
**Аляксандр Паўлавіч**

# ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ І РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦЭРКВАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (1863–1905 гг.)

Аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата юрыдычных навук

па спецыяльнасці 12.00.01 – тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя
вучэнняў аб праве і дзяржаве

Мінск, 2013

Работа выканана ва ўстанове адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

Навуковы кіраўнік: **Кадаўбовіч Валерый Андрэевіч**, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт, прафесар кафедры, УА «Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва», кафедра дзяржаўна-праваых і гуманітарных дысцыплін

Афіцыйныя апаненты: **Вішнеўскі Аляксей Фёдаравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры, УА «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

**Шчэрбік Дзмітрый Васільевіч**, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры, УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

Апаніруючая арганізацыя: **УА «Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь»**

Абарона адбудзецца 28 студзеня 2014 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.01 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўд. 407, тэл. (8–017)226–55–41.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы 17 снежня 2013 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат юрыдычных навук, дацэнт У.М. Сатолін

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

# УВОДЗІНЫ

На працягу многіх стагоддзяў Хрысціянства адыгрывала ролю галоўнага культурна-каштоўнаснага падмурка еўрапейскага грамадства. Асновы хрысціянскага веравучэння былі і застаюцца па сённяшні дзень важнай крыніцай сучаснага права. Зыходзячы з гэтага, даследаванні рэлігійнага права, прававога рэгулявання дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін, прававога становішча хрысціянскіх канфесій з'яўляюцца неад'емнай часткай навуковай праблематыкі. Аднак у розныя гістарычныя перыяды сутнасць і накірункі такіх даследаванняў залежалі ад дамінуючых ідэалагічных падыходаў. Усёабдымная сацыяльная трансфармацыя, выкліканая атрыманнем Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту, актуалізавала неабходнасць аб'ектыўнай пераацэнкі ролі рэлігійнага фактару ў айчыннай гісторыі і ступені яго ўплыву на фарміраванне нацыянальнай прававой сістэмы.

Пераасэнсаванне духоўных каштоўнасцей на мяжы 80-х–90-х гадоў XX ст. прывяло да росту ўзроўню рэлігійнасці беларускага грамадства. Сёння каля 65% дарослага насельніцтва Беларусі лічаць сябе веруючымі. Сярод веруючых прыкладна 81% праваслаўных, 10,5% католікаў, 1% іудзеяў, 0,5% пратэстантаў і столькі ж мусульман[1]. Дадзеныя лічбы сведчаць аб узрастанні грамадскага прэстыжу і рэальнай ролі рэлігіі, рэлігійных канфесій у сацыяльных працэсах. Беларуская Праваслаўная і Рымска-каталіцкая Цэрквы, як найбольш масавыя і ўплывовыя інстытуты грамадзянскай супольнасці, знаходзяцца ў пастаянным супрацоўніцтве з дзяржавай у разнастайных сацыяльных сферах.

12 чэрвеня 2003 г. было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой, у адпаведнасці з якім былі вызначаны прыярытэтныя накірункі сумеснай дзейнасці дзяржавы і Царквы: грамадская мараль; выхаванне і адукацыя; культура і творчая дзейнасць; ахова, аднаўленне і развіццё гістарычнай і культурнай спадчыны; ахова здароўя; сацыяльнае забеспячэнне; міласэрнасць; дабрачыннасць; падтрымка інстытута сям'і, бацькоўства і дзяцінства; апека над асобамі, што знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі; выхаваўчая, сацыяльная і псіхалагічная работа з ваеннаслужачымі; ахова навакольнага асяроддзя. Традыцыйнымі і ўстойлівымі сталі кантакты кіраўніцтва беларускай дзяржавы з Маскоўскай Патрыярхіяй. На якасна новы ўзровень выйшла ўзаемадзеянне Рэспублікі Беларусь і Ватыкана. Аб гэтым сведчаць візіт у Мінск 18–22 чэрвеня 2008 г. дзяржсакратара Папы Рымскага кардынала Тарчызіо Бертоне і наведванне Ватыкана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам 27 красавіка 2009 г. Для далейшай гарманізацыі партнёрскіх узаемаадносін паміж дзяржавай і

[1]Республика Беларусь в зеркале социологии : сборник материалов социологических исследований за 2011 г. / Информационно-аналитический центр при Президенте Республики Беларусь ; под ред. Л.Е. Криштановича. – Минск : Бизнесофсет, 2012. – С. 44.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

вядучымі хрысціянскімі канфесіямі ў рэгіёне, забеспячэння міжканфесійнай згоды і ўдасканальвання нацыянальнай мадэлі дзяржаўна-царкоўных адносін значымым з'яўляецца вывучэнне гістарычнага вопыту рэгламентацыі прававога статусу рэлігійных аб'яднанняў.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.**

Работа падрыхтавана ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» (ДПНД «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава») і калектыўнай навукова-даследчай тэмы юрыдычнага факультэта УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» «Прыярытэтныя накірункі развіцця прававой сістэмы грамадства» (ГБ 11–29; 2011–2015 гг.). Распрацоўка тэмы праходзіла таксама ў працэсе ажыццяўлення навукова-даследчай работы суіскальніка па гранту Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Прававое становішча Рускай Праваслаўнай Царквы і Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі (1863–1905 гг.): параўнальны аналіз» (№ дзяржрэгістрацыі 20100505 ад 06.04.2010).

**Мэта і задачы даследавання.**

Мэтай даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцей, асноўных тэндэнцый і заканамернасцей працэсу замацавання прававога становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг.

Для дасягнення мэты пастаўлены наступныя задачы:

выявіць асаблівасці заканадаўчага афармлення прававога статусу Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў у Расійскай імперыі;

вылучыць характэрныя рысы адміністрацыйнай структуры Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях;

вызначыць спецыфіку прававога становішча праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства на беларускіх землях;

прааналізаваць механізмы прававога рэгулявання маёмаснага становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях;

ахарактарызаваць асаблівасці сучаснай мадэлі дзяржаўна-царкоўных адносін у Рэспубліцы Беларусь, унесці прапановы па далейшай яе аптымізацыі.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляюцца ўрэгуляваныя нормамі права дзяржаўна-канфесійныя адносіны на беларускіх землях у 1863–1905 гг.

**Прадмет даследавання** складаюць нарматыўныя прававыя акты Расійскай імперыі, якія вызначалі прававое становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гадах, а таксама матэрыялы правапрымяняльнай практыкі, якія дазваляюць раскрыць ступень

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

эфектыўнасці механізму прававога рэгулявання ў сферы дзяржаўна-канфесійных стасункаў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Аўтарская характарыстыка мадэлі (формы) дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у Расійскай імперыі, на падставе якой ажыццяўлялася замацаванне прававога статусу Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Фарміраванне ў Расійскай дзяржаве (ад пачатку XVIII ст.) абсалютысцкай формы праўлення заканамерна прывяло да выпрацоўкі «сінадальнай» формы адносін Царквы і дзяржавы, якая спалучыла ў сабе традыцыйную для Маскоўскай дзяржавы дактрыну «сімфоніі» і характэрную для заходнееўрапейскіх абсалютных манархій пратэстанцкую дактрыну «дзяржаўнай царкоўнасці». Асноўнымі рысамі «сінадальнай» мадэлі былі наступныя: 1) кіраўніком Рускай Праваслаўнай Царквы абвяшчаўся імператар Расійскай імперыі; 2) за Праваслаўем у расійскім заканадаўстве замацоўваўся статус дзяржаўнага («пануючага») веравызнання; 3) наяўнасць у імперыі дзяржаўнай рэлігіі спалучалася з заканадаўчымі гарантыямі свабоднага ажыццяўлення рэлігійнай дзейнасці іншымі «цярпімымі» (як хрысціянскімі, так і нехрысціянскімі) канфесіямі пры ўмове, што апошнія не будуць пасягаць на асновы імперскага ладу і распаўсюджваць сваю місію на праваслаўнае насельніцтва; 4) пазіцыянаванне Расійскай імперыі ўнутры краіны і на міжнароднай арэне ў якасці праваслаўнай хрысціянскай дзяржавы пацвярджалася заканадаўчымі гарантыямі аховы і прывілеяванага становішча ўсіх хрысціянскіх канфесій; 5) замацаванне за Праваслаўем статусу дзяржаўнай рэлігіі сведчыла аб тым, што праваслаўная рэлігія з'яўлялася важнейшай крыніцай духоўных каштоўнасцей, светапогляднай асновай імперскай ідэалогіі; адпаведна, Праваслаўе непасрэдным чынам уплывала на афармленне норм імперскага права, з'яўлялася індыкатарам асноў маральнасці права; 6) у Расійскай імперыі захоўвалася даволі шырокая (у параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі) прастора грамадскіх адносін (шлюбная сфера, прымяненне царкоўных пакаранняў у сферы крымінальнага права, рашэнне некаторых маёмасных спрэчак з удзелам духоўных устаноў), урэгуляваных рэлігійнымі нормамі, калі права толькі пацвярджала легітымнасць рэлігійна-маральных нормаў; прычым адпаведныя адносіны, што тычыліся падданых іншаслаўных веравызнанняў, рэгуляваліся паводле кананічных нормаў «замежных» хрысціянскіх канфесій; 7) «сінадальная» форма дзяржаўна-царкоўных адносін выключала неабходнасць для свецкіх улад аддзялення Царквы ад дзяржавы, таму што ў адпаведнасці з характэрнымі для гэтай формы прынцыпамі «сімфоніі» Праваслаўная Царква выступала сацыяльным партнёрам, а не канкурэнтам дзяржавы ў барацьбе за ўплыў на палітычныя працэсы і грамадства ў цэлым.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

2. Выяўленыя аўтарам тэндэнцыі, пад уздзеяннем якіх фарміравалася прававое становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у даследуемы перыяд: а) тэндэнцыя «адзяржаўлення» Рускай Праваслаўнай Царквы, якая вынікала з сутнасці дактрыны «дзяржаўнай царкоўнасці», прадугледжвала ўстанаўленне падкантрольнасці канфесіі дзяржаве і інтэграцыю царкоўных структур у адміністрацыйны апарат Расійскай імперыі, суправаджалася парушэннямі некаторых асноў кананічнага ўладкавання канфесіі; па меры пашырэння межаў імперыі і пераўтварэння яе ў поліканфесійную дзяржаву гэта тэндэнцыя распаўсюджвалася і на іншыя канфесіі, у тым ліку і на Рымска-каталіцкую Царкву; б) тэндэнцыя супрацоўніцтва і ўзаемапавагі паміж дзяржавай і Царквой, якая вынікала з сутнасці дактрыны «сімфоніі» і абумоўлівалася пазіцыянаваннем Расійскай імперыі як праваслаўнай хрысціянскай дзяржавы, прадвызначала прывілеяванае становішча хрысціянскіх канфесій у імперыі; прававы статус праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій вызначаўся расійскім заканадаўствам і нормамі кананічнага права, больш за тое, прасочвалася рэцэпцыя кананічнага права: рэлігійныя нормы знаходзілі сваё замацаванне ў імперскім заканадаўстве; в) тэндэнцыя аднаўлення пазіцый Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях: доўгачасовае (ад 1385 г.) існаванне праваслаўнай канфесіі ва ўмовах палітыка-прававой дыскрымінацыі, балансаванне на мяжы канчатковага паглынання Праваслаўя Каталіцкай Царквой прывялі да катастрафічнага стану праваслаўнай канфесіі на яе кананічнай тэрыторыі, гэтыя абставіны вымагалі пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ажыццяўлення комплексу ўрадавых мерапрыемстваў, скіраваных на адраджэнне Праваслаўнай Царквы; г) тэндэнцыя прадухілення ўдзелу Рымска-каталіцкай Царквы ў антыўрадавых выступленнях, скіраваных на аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай і, адпаведна, пануючага становішча Каталіцызму ў рэгіёне; у выніку чаго ўзнікала калізія інтарэсаў каталіцкай канфесіі, якая была незадаволена сваім афіцыйным статусам у Расійскай імперыі, і дзяржавы, якая вымагала ад канфесіі лаяльнасці імперскаму правапарадку ўзамен на гарантыі верацярпімасці.

3. На падставе аналізу нормаў імперскага заканадаўства і кананічнага права даецца аўтарская характарыстыка працэсу адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях. Устаноўлена, што асаблівасці працэсу фарміравання адміністрацыйнай структуры праваслаўнай канфесіі ў Беларусі абумоўліваліся тэндэнцыяй адраджэння Праваслаўнай Царквы ў рэгіёне: ажыццяўлялася стварэнне праваслаўных епархій (Мінскай (1793 г.), Полацкай (1833 г.), Літоўскай (1839 г.), Гродзенскай (1900 г.)), адбылося вяртанне ўніятаў ва ўлонне Праваслаўя, паступова (асабліва актыўна ў перыяд пасля паўстання

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

1863–1864 гг.) пашыралася сетка праваслаўных прыходаў. У выніку гэтых мерапрыемстваў Руская Праваслаўная Царква здолела аднавіць пазіцыі на сваёй кананічнай тэрыторыі і вярнуць сабе статус найбуйнейшай канфесіі на беларускіх землях.

Асновы адміністрацыйнага ўладкавання Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях былі канстытуяваны ў канкардаце 1847 г. паміж Пецярбургам і Святым Прастолам. Гэты дагавор прадугледжваў функцыянаванне ў межах імперыі разгалінаванай сеткі рымска-каталіцкіх епархій (Магілёўская, Віленская і Мінская епархіі ахоплівалі тэрыторыю Беларусі), дэканатаў, прыходаў і манастыроў. Аднак падтрымка Рымска-каталіцкай Царквой паўстання 1863–1864 гг. прадвызначыла заканамернасць мер дзяржаўнага рэагавання, скіраваных на забеспячэнне ўнутранай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці імперыі, што прывяло да парушэння некаторых асноў кананічнага ўладкавання Каталіцкай Царквы на беларускіх землях. У выніку прыпынення дзейнасці канкардату (з 1866 г.) стала магчымай ліквідацыя Мінскай епархіі (1869 г.), а таксама значнай колькасці прыходаў і манастыроў, адмена аўтаномнага статусу манаскіх ордэнаў.

4. Упершыню праведзены заснаваны на выкарыстанні шырокага кола архіўных і апублікаваных крыніц параўнальны аналіз прававога становішча праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Устаноўлена, што ў перыяд да паўстання 1863–1864 гг. прававы статус праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства ў Беларусі не меў істотных адрозненняў. Расійскае заканадаўства гарантавала прадстаўнікам хрысціянскага духавенства прывілеяванае становішча ў структуры імперскага грамадства, надзяляла іх аднолькавым комплексам правоў і абавязкаў. Акрамя палажэнняў дзяржаўнага заканадаўства, прававы статус духавенства вызначаўся нормамі кананічнага права. Прычым шэраг кананічных правілаў субсідыярна ахоўваўся імперскім правам (напрыклад, абмежаванне грамадзянскіх правоў манаства, вызначэнне відаў дзейнасці, несумяшчальных са свяшчэнствам).

Аднак падтрымка рымска-каталіцкім духавенствам паўстанцкага руху 1863–1864 гг. прымусіла ўлады прыняць комплекс мер, скіраваных на далейшае прадухіленне ўдзелу духоўных асоб у антыўрадавых выступленнях. Апошнія абставіны прывялі да таго, што некаторыя агульнаімперскія заканадаўчыя нормы былі заменены цыркулярамі генерал-губернатараў Паўночна-Заходняга краю, якія прадвызначылі спецыфіку прававога становішча каталіцкага духавенства на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Шэраг падзаконных актаў мясцовых улад устанаўліваў дадатковыя меры кантролю за духавенствам і абмяжоўваў публічнае адпраўленне некаторых каталіцкіх культавых практык. Адначасова з гэтым імперскія ўлады ініцыявалі шэраг мерапрыемстваў, скіраваных на ўмацаванне становішча праваслаўнага духавенства на беларускіх

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)
землях. Прынятце і рэалізацыя ў 1860–1880-х гадах комплексу заканадаўчых актаў прывялі да паляпшэння матэрыяльнага становішча і павышэння сацыяльнага прэстыжу праваслаўнага прыходскага кліру.

5. Прааналізавана спецыфіка прававога рэгулявання маёмаснага становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Згодна з імперскім заканадаўствам, праваслаўныя і рымска-каталіцкія духоўныя ўстановы атрымлівалі ў валоданне ад дзяржавы ненаселеныя зямельныя надзелы, забяспечваліся штогадовым казённым утрыманнем. Рэлігійным арганізацыям гарантавалася права на набыццё нерухомай уласнасці (са згоды дзяржаўных улад), дазвалялася перадача зямельных надзелаў у наём.

Матэрыяльнае становішча Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях у даследуемы перыяд заставалася ўстойлівым. Зыходзячы з таго, што да секулярызацыі населеных зямельных маёнткаў рэлігійных арганізацый (1841–1842 гг.) рымска-каталіцкія духоўныя ўстановы з'яўляліся буйнымі землеўладальнікамі ў рэгіёне, ім гарантаваўся значна большы ў параўнанні з праваслаўнымі рэлігійнымі арганізацыямі памер казённага ўтрымання. Акрамя таго, заканадаўствам прадугледжвалася наяўнасць дадатковага капіталу рымска-каталіцкага духавенства. Нават падзеі паўстання 1863–1864 гг. не прынеслі істотных негатыўных тэндэнцый у парадак прававога рэгулявання маёмаснага становішча Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях.

У той жа час матэрыяльнае становішча Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях, у выніку доўгатэрміновай палітыка-прававой дыскрымінацыі Праваслаўя ў Рэчы Паспалітай і беднасці праваслаўнай паствы, знаходзілася ў нездавальняючым стане. Дзеля выпраўлення сітуацыі дзяржава прымала шэраг заканадаўчых актаў, скіраваных на забеспячэнне праваслаўных рэлігійных арганізацый дадатковымі фінансавымі сродкамі, зямельнымі надзеламі, ляснымі і іншымі ўгоддзямі.

6. Зыходзячы з аналізу тэндэнцый і заканамернасцей замацавання прававога становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг., выяўлена гістарычная абгрунтаванасць сучаснай мадэлі дзяржаўна-царкоўных адносін у Рэспубліцы Беларусь, для якой характэрна прызнанне істотнай ролі Праваслаўнай Царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа, а таксама ўкладу іншых традыцыйных канфесій у культуру краіны. Ва ўмовах развіцця постмадэрнага грамадства і няўхільнага ўзрастання ролі рэлігійнага фактару выяўляецца аб'ектыўная неабходнасць забеспячэння сумяшчальнасці права з нацыянальнымі духоўна-культурнымі каштоўнасцямі беларускага народа. У гэтай сувязі асэнсаванне гістарычнага вопыту

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

дзяржаўна-канфесійных адносін на беларускіх землях з'яўляецца карысным для развіцця нацыянальнай прававой сістэмы.

**Асабісты ўклад суіскальніка.**

Дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананай аўтарскай работай, напісанай на падставе аналізу шырокай базы дакументальных, архіўных крыніц і навуковай літаратуры. Дысертантам быў самастойна выяўлены, апрацаваны і ўпершыню ўведзены ў навуковы абарот шэраг неапублікаваных дакументаў з фондаў Нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі ў г. Мінску і г. Гродна, якія садзейнічаў больш поўнаму ўсведамленню спецыфікі прававога становішча праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій на беларускіх землях.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.**

Вывады дысертацыйнага даследавання прадстаўлены аўтарам у дакладах і выступленнях на 12 рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях: XI рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Инновация – 2004» (Мазыр, 22 красавіка 2004 г.), X рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэст, 15–16 мая 2008 г.), I і II рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях «Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стст.: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы» (Гомель, 1–2 кастрычніка 2009 г.; 13–14 кастрычніка 2011 г.), юбілейнай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 40-годдзю Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны (Гомель, 11 чэрвеня 2009 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Правовое обеспечение устойчивого развития Республики Беларусь» (Гомель, 9–10 красавіка 2010 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Духовно-нравственное воспитание на основе отечественных культурно-исторических традиций и ценностей» (Жыровічы, 27 мая 2010 г.), III міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы» (Гомель, 30 верасня–1 кастрычніка 2010 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Развитие современного региона: перекрёстки науки и практики» (Саратаў, 25–26 кастрычніка 2010 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Приоритетные направления развития правовой системы общества» (Гомель, 6–7 красавіка 2012 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў «Содружество наук. Барановичи – 2012» (Баранавічы, 23–24 мая 2012 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Одинадцяті осінні юридичні читання» (г. Хмяльніцкі, 23–24 лістапада 2012 г.).

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі выкарыстаны ў навучальным працэсе на юрыдычным факультэце ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» ў ходзе выкладання дысцыплін «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», «Гісторыя дзяржавы і права славянскіх народаў».

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.**

Асноўныя вынікі і палажэнні дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 19 навуковых працах (7,6 аўт. аркуша), з іх 6 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (4,2 аўт. арк.), 4 – у зборніках навуковых прац. 9 публікацый з'яўляюцца матэрыяламі і тэзісамі выступленняў на навуковых канферэнцыях.

**Структура і аб'ём дысертацыі.**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння і бібліяграфічнага спісу. Поўны аб'ём дысертацыі – 136 старонак, з іх 112 старонак асноўнага тэксту. Бібліяграфічны спіс складаецца з 281 найменні і 19 публікацый дысертанта.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Асноўная частка дысертацыі ўключае тры главы. У **главе 1 «Гістарыяграфія праблемы, крыніцы і метады даследавання»** падаецца аналітычны агляд літаратуры па тэме дысертацыі, аналіз гістарычных крыніц і метадаў даследавання. Істотны ўклад у распрацоўку праблемы ўнеслі дарэвалюцыйныя навукоўцы, якія ажыццяўлялі даследаванні праблем царкоўнага права, вывучалі асаблівасці мадэлі дзяржаўна-канфесійных адносін у Расійскай імперыі (М.С. Сувораў, А.С. Паўлаў, І.С. Берднікаў і інш.), спецыфіку канфесійнай палітыкі расійскай адміністрацыі на заходніх ускраінах імперыі (М.В. Каяловіч, П.Н. Бацюшкаў, А.І. Мілавідаў, Г.Я. Кіпрыяновіч і інш.). Савецкія гісторыкі і правазнаўцы, якія працавалі ў рэчышчы марксісцка-ленінскай атэістычнай ідэалогіі, давалі негатыўныя ацэнкі ролі рэлігіі ў жыцці грамадства, абгрунтоўвалі высновы аб тым, што Праваслаўная і Рымска-каталіцкая Цэрквы выступалі саюзнікамі пануючых класаў у працэсе эксплуатацыі народных мас (М.М. Нікольскі, А.Ф. Грэкулаў, П.М. Кірушын, М.М. Шэйнман, В.В. Клачкоў і інш.). У сучаснай навуцы адбываецца пераасэнсаванне ролі рэлігійных канфесій у працэсе грамадскага развіцця, удасканальваюцца метадалагічныя падыходы, істотна пашыраецца крыніцавая база даследаванняў (за кошт выяўлення шырокага пласта невядомых да гэтага часу архіўных крыніц, выдання зборнікаў дакументаў), пашыраецца праблематыка даследаванняў. У дадзеным рэчышчы працуюць беларускія (В.В. Яноўская, А.І. Ганчар, А.Ю. Бендзін, С.А. Калінін і інш.), расійскія (А.А. Дорская, протаіерэй У. Цыпін, В.А. Ліцэнбергер, М.Д. Далбілаў і інш.), заходнееўрапейскія і амерыканскія (М. Радван, Д. Сталюнас, Г. Фрыз, Т. Уікса і інш.) навукоўцы. Аднак пытанні прававога становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. даследаваны

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

толькі фрагментарна, таму на сённяшні дзень выразна выявілася задача глыбокага і цэласнага тэарэтычнага асэнсавання гэтай праблематыкі.

**Глава 2 «Прававое становішча Рускай Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях (1863–1905 гг.)»** складаецца з чатырох раздзелаў. У раздзеле 2.1 *«Афармленне прававога статусу Рускай Праваслаўнай Царквы ў заканадаўстве Расійскай імперыі»* даецца аўтарская характарыстыка формы (мадэлі) дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у Расійскай імперыі, зыходзячы з якіх ажыццяўлялася замацаванне прававога статусу Рускай Праваслаўнай Царквы ў імперскім заканадаўстве. Вылучаюцца асноўныя рысы «сінадальнай» мадэлі адносін Царквы і дзяржавы. Праведзены аналіз заканадаўчых нормаў, якія рэгламентавалі разнастайныя аспекты прававога становішча канфесіі ў Расійскай дзяржаве. Зыходзячы з аналізу вопыту прававога рэгулявання сферы дзяржаўна-царкоўных стасункаў у Расійскай імперыі, выяўляецца гістарычная абгрунтаванасць абрання Рэспублікай Беларусь дзеючай мадэлі ўзаемаадносін дзяржавы і рэлігійных канфесій.

У раздзеле 2.2 *«Адміністрацыйная структура Рускай Праваслаўнай Царквы»* на падставе аналізу нормаў імперскага заканадаўства і кананічнага права асвятляецца працэс адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях. Выяўляюцца тэндэнцыі, якія абумоўлівалі асаблівасці фарміравання адміністрацыйнай структуры канфесіі ў рэгіёне, разглядаюцца прававыя асновы стварэння праваслаўных епархій і пашырэння сеткі прыходаў, скіраваныя на аднаўленне пазіцый Рускай Праваслаўнай Царквы на сваёй кананічнай тэрыторыі.

У раздзеле 2.3 *«Прававое становішча праваслаўнага духавенства»* даследуюцца нормы заканадаўства Расійскай імперыі і кананічнага права, якія вызначалі прававы статус праваслаўнага духавенства на беларускіх землях. На падставе аналізу гэтых нормаў выяўляецца працэс рэцэпцыі кананічнага права: кананічныя нормы, якія рэгулявалі прававы статус прыходскага і манаскага духавенства, знаходзілі сваё замацаванне ў імперскім заканадаўстве. У той жа час у раздзеле выяўлены і асобныя выпадкі калізій нормаў свецкага і царкоўнага права, якія вынікалі з тэндэнцыі «адзяржаўлення» Царквы і неабходнасці інтэграцыі духавенства ў адміністрацыйны апарат Расійскай імперыі. Істотная ўвага надаецца разгляду коплексу заканадаўчых актаў, прынятых у 1860–1880-х гадах, скіраваных на паляпшэнне матэрыяльнага становішча і павышэнне сацыяльнага прэстыжу праваслаўнага духавенства Беларусі.

У раздзеле 2.4 *«Прававое рэгуляванне маёмаснага становішча Рускай Праваслаўнай Царквы»* даследуюцца нормы расійскага заканадаўства, якія рэгламентавалі маёмаснае становішча Царквы. Вызначаюцца тэндэнцыі, пад уздзеяннем якіх фарміраваўся адпаведны статус канфесіі, разглядаюцца ўрадавыя мерапрыемствы, скіраваныя на забеспячэнне фінансавай залежнасці

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

укладу рэлігійных канфесій у працэс станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці і духоўна-культурных традыцый беларускага народа.

Абраная Беларуссю стратэгія цалкам адпавядае гістарычнаму і сучаснаму вопыту дзяржаўна-царкоўных адносін у краінах Еўропы. У гэтай сувязі цалкам заканамернай з'яўляецца адмова Рэспублікі Беларусь ад амерыканскай мадэлі дзяржаўна-царкоўных адносін, што была закладзена ў аснову першай рэдакцыі Закона «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый» (1992 г.), дзе ігнараваўся гістарычны ўклад Праваслаўнай Царквы і іншых традыцыйных для Беларусі канфесій у культурнае развіццё і станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Ва ўмовах развіцця постмадэрнага грамадства і няўхільнага ўзрастання ролі рэлігійнага фактару выяўляецца аб'ектыўная неабходнасць актывізацыі супрацоўніцтва паміж Беларускай дзяржавай і традыцыйнымі для краіны канфесіямі, перад усім з Праваслаўнай Царквой, якая з'яўляецца генетычна першаснай хрысціянскай канфесіяй на беларускіх землях, была і застаецца найбольш масавым веравызнаннем у краіне, сімвалам нацыянальнай ідэнтычнасці. Гэтыя акалічнасці пацвярджаюць неабходнасць забеспячэння сумяшчальнасці права з нацыянальнымі духоўна-культурнымі каштоўнасцямі беларускага народа [1; 2; 3; 4; 6; 8; 9].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі.** Змешчаны ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны ў працэсе далейшай навуковай распрацоўкі царкоўнага (рэлігійнага) права, праблем свабоды сумлення ў Беларусі, гісторыі канфесій. Вывады, зробленыя суіскальнікам, могуць быць запатрабаваны ў педагагічнай дзейнасці, у выкладанні курсаў гісторыі дзяржавы і права Беларусі, гісторыі дзяржавы і права замежных краін, айчыннай гісторыі, гісторыі Расіі, рэлігіязнаўства. Вывучэнне дзяржаўна-канфесійных узаемаадносін і зробленыя на гэтай падставе высновы могуць аказаць дапамогу дзяржаўным органам у дзейнасці па аптымізацыі дзяржаўна-царкоўных і міжканфесійных стасункаў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых часопісах

1. Грахоцкі, А.П. Некаторыя аспекты прававога рэгулявання дзейнасці Рымска-каталіцкага Касцёла ў Расійскай імперыі ў XIX ст. / А.П. Грахоцкі // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 2009. – № 3. – С. 50–56.

2. Грахоцкі, А.П. Нормы царкоўнага права ў шлюбаразводным працэсе другой паловы XIX–пачатку XX ст. (па матэрыялах Мінскай епархіі) / А.П. Грахоцкі // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2010. – № 3. – С. 55–67.

3. Грахоцкі, А.П. Прымяненне нормаў царкоўнага права ў рэгуляванні парадку заключэння шлюбу ў Беларусі (другая палова XIX–пачатак XX ст.) / А.П. Грахоцкі // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2010. – № 5. – С. 139–146.

4. Грахоцкі, А.П. Адміністрацыйная структура Рускай Праваслаўнай Царквы ў сінадальны перыяд: калізіі кананічнага і свецкага права / А.П. Грахоцкі // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 4. Правазнаўства. – 2012. – № 1. – С. 28–40.

5. Грахоцкі, А.П. Прававое рэгуляванне парадку рэлігійнай канверсіі ў Беларусі (1863–1905 гг.) / А.П. Грахоцкі // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2012. – № 1. – С. 4–18.

6. Грахоцкі, А.П. Прававое становішча праваслаўнага прыходскага духавенства на беларускіх землях (1863 – 1905 гг.) / А.П. Грахоцкі // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2013. – № 2. – С. 123–132.

### Артыкулы ў зборніках навуковых прац

7. Грахоцкі, А.П. «Возвращение в православие» : масавая канверсія каталікоў Беларусі ў праваслаўе ў 60-ыя гады XIX ст. (па матэрыялах Мінскай губерні) / А.П. Грахоцкі // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стст. : этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : зборнік навуковых артыкулаў : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: В.А. Міхедзька [і інш.]. – Гомель, 2009. – Ч. 1. – С. 21–31.

8. Грахоцкі, А.П. Духоўны суд у Расійскай імперыі (другая палова XIX–пачатак XX ст.) / А.П. Грахоцкі // Правовое обеспечение устойчивого развития Республики Беларусь : сб. науч. труд. / Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; под общ. ред. И.И. Эсмантович. – Гомель, 2010. – С. 8–12.

9. Грахоцкі, А.П. Прававое становішча рымска-каталіцкага духавенства ў Беларусі (1863–1905 гг.) / А.П. Грахоцкі // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки :

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

сб. науч. ст. Выпуск 10 (15) : в 2 ч. / Респ. ин-т высш. школы ; под ред. В.Ф. Беркова. – Минск, 2010. – Ч. 1. – С. 41–49.

10. Грахоцкий, А.П. Российская администрация и православное духовенство на белорусских землях в 1860-ые годы : некоторые аспекты взаимоотношений / А.П. Грахоцкий // Развитие современного региона : перекрёстки науки и практики : сб. науч. ст. / Поволжская акад. гос. Службы ; редкол. : Т.Ю. Смолова [и др.]. – Саратов, 2010. – С. 8–12.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

11. Грахоцкі, А.П. Каталіцкі касцёл у палітыцы М.М. Мураўёва на Беларусі (1863–1865 гг.) / А.П. Грахоцкі // Инновации – 2004 : материалы XI Республиканской студенческой научно-практической конференции, Мозырь, 22 апреля 2004 г. : в 2 ч. / Мозыр. гос. пед. ун-т ; редкол : С.Б. Кураш [и др.] – Мозырь, 2004. – Ч. 2. – С. 75.

12. Грахоцкі, А.П. Сучасная расійская гістарыяграфія ўрадавай палітыкі на Беларусі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. // X Республиканская научно-методическая конференция молодых учёных : сб. тезисов докл., Брест, 15–16 мая 2008 г. / Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина ; под общ. ред. К.К. Красовского. – Брест, 2008. – С. 154.

13. Грахоцкі, А.П. Фарміраванне рэжыму «выключных законаў» у Беларусі (60–70-ыя гг. XIX ст.) / А.П. Грахоцкі // Материалы юбилейной научно-практической конференции, посвящённой 40-летию Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины, Гомель, 11 июня 2009 г. : в 4 ч. / Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол. : О.М. Демиденко [и др.]. – Гомель, 2009. – Ч. 3. – С. 17–20.

14. Грахоцкі, А.П. Сакральнае і секулярнае ў шлюбаразводным праве Расійскай імперыі (другая палова XIX–пачатак XX ст.) / А.П. Грахоцкі // Духовно-нравственное воспитание на основе отечественных культурно-исторических традиций и ценностей : материалы Междун. науч.-практ. конф., Жировичи, 27 мая 2010 г. / НАН Беларуси, Ин-т философии, Бел. Экзархат Моск. Патриархата РПЦ ; науч. ред. совет : М.В. Мясникович, Высокопреосвящ. Филарет [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – С. 243–245.

15. Грахоцкі, А.П. Адміністрацыйная рэгламентацыя адпраўлення рымска-каталіцкага культу ў Беларусі (1863–1905 г.) / А.П. Грахоцкі // Беларусь і суседзі : гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы : матэрыялы III міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гомель, 30 верасня–1 кастрычніка 2010 г. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: Р.Р. Лазько [і інш.]. – Гомель, 2010. – С. 115–121.

16. Грахоцкі, А.П. Прававое становішча праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства ў Беларусі : параўнальны аналіз // Беларусь у

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стст. : этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, Гомель, 13–14 кастрычніка 2011 г. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. : В.А. Міхедзька (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2011. – С. 47–52.

17. Грахоцкі, А.П. Расійскія ўлады versus рымска-каталіцкія манастыры : да праблемы дзяржаўна-канфесійных стасункаў на беларускіх землях (другая палова XIX – пачатак XX ст.) / А.П. Грахоцкі // Приоритетные направления развития правовой системы общества : материалы Междунар. науч.-практ. конф., 6–7 апреля 2012 г. / редкол. : И.И. Эсмантович (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2012. – С. 29–33.

18. Грахоцкі, А.П. Да пытання аб дзяржаўна-царкоўных адносінах у Расіі эпохі Пятра I / А.П. Грахоцкі // Содружество наук. Барановичи–2012 : материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, г. Барановичи, 23–24 мая 2012 г. : в 3 ч. / Барановичский государственный университет ; редкол. : А.В. Никишова (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи : РИО БарГУ, 2012. – Ч. 3. – С. 54–57.

19. Грахоцкий, А.П. Правовое регулирование конфессиональных переходов в Российской империи (вторая половина XIX–начало XX вв.) / А.П. Грахоцкий // Актуальні проблеми юридичної науки : збірник тэз Міжнародної конференції «Одинадцяті осінні юридичні читання», м. Хмельницький, 23–24 листопада 2012 г. : у 4 ч. – Хмельницький : Вид-во Хмельницьк. ун-ту управл. та права, 2012. – С. 33–35.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

# РЭЗЮМЭ

**Грахоцкі Аляксандр Паўлавіч**

**Прававое становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях (1863–1905 гг.)**

**Ключавыя словы**: прававое становішча, Руская Праваслаўная Царква, Рымска-каталіцкая Царква, Расійская імперыя, беларускія землі, заканадаўства, кананічнае права, прыходскае духавенства, манаства.

**Мэта работы** заключаецца ў выяўленні асаблівасцей, асноўных тэндэнцый і заканамернасцей прававога становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг.

**Метады даследавання**: метадалагічную аснову дысертацыйнага даследавання склалі прынцыпы аб'ектыўнасці і гістарызму. Выкарыстаны агульнанавуковыя (параўнальны, аналізу, сінтэзу, індукцыі, дэдукцыі), спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны), спецыяльна-прававыя (параўнальна-прававы, структурна-прававы, сістэмна-прававы, тлумачэння прававых нормаў) метады.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** упершыню ў гісторыка-прававой навуцы праведзены комплексны аналіз прававога становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг., прааналізавана шырокае кола заканадаўчых актаў і нормаў кананічнага права, у якіх змяшчаліся асноўныя палажэнні прававога статусу рэлігійных канфесій у Расійскай дзяржаве, дадзена аўтарская характарыстыка мадэлі дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у імперыі, выяўлены тэндэнцыі, пад уздзеяннем якіх фарміравалася прававое становішча канфесій, даследавана адміністрацыйная структура Цэркваў, асаблівасці прававога становішча праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства, прааналізавана спецыфіка прававога рэгулявання маёмаснага становішча Цэркваў, выяўлена гістарычная абгрунтаванасць абрання Рэспублікай Беларусь дзеючай мадэлі ўзаемаадносін дзяржавы і рэлігійных канфесій.

**Ступень выкарыстання:** вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе на юрыдычным факультэце УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» ў ходзе выкладання дысцыплін «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», «Гісторыя дзяржавы і права славянскіх народаў».

**Галіна прымянення:** вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў выкладчыцкай дзейнасці, працэсе далейшай навуковай распрацоўкі рэлігійнага права, праблем свабоды сумлення, гісторыі канфесій, у рабоце дзяржаўных органаў па аптымізацыі міжканфесійных стасункаў.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

## РЕЗЮМЕ

**Грахоцкий Александр Павлович**

**Правовое положение Русской Православной и Римско-католической Церквей на белорусских землях (1863–1905 гг.)**

**Ключевые слова**: правовое положение, Русская Православная Церковь, Римско-католическая Церковь, Российская империя, белорусские земли, законодательство, каноническое право, приходское духовенство, монашество.

**Цель работы** состоит в выявлении особенностей, основных тенденций и закономерностей правового положения Русской Православной и Римско-католической Церквей на белорусских землях в 1863–1905 гг.

**Методы исследования**: методологическую основу диссертационного исследования составили принципы объективности и историзма. Использованы общенаучные (сравнительный, анализ, синтез, индукция, дедукция); специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный), специально-правовые (сравнительно-правовой, структурно-правовой, системно-правовой, толкования правовых норм) методы.

**Полученные результаты и их новизна**: впервые в историко-правовой науке проведён комплексный анализ правового положения Русской Православной и Римско-католической Церквей в Беларуси в 1863–1905 гг., проанализирован широкий круг законодательных актов и норм канонического права, в которых содержались основные положения правового статуса религиозных конфессий в Российском государстве, дана авторская характеристика модели государственно-церковных взаимоотношений в империи, выявлены тенденции, под воздействием которых формировалось правовое положение конфессий, исследованы административная структура Церквей, особенности правового положения православного и римско-католического духовенства, проанализирована специфика правового регулирования имущественного положения Церквей, выявлена историческая обоснованность избрания Республикой Беларусь действующей модели взаимоотношений государства и религиозных конфессий.

**Степень использования:** результаты исследования используются в учебном процессе на юридическом факультете УО «ГГУ им. Ф. Скорины» в ходе преподавания дисциплин «История государства и права Беларуси», «История государства и права славянских народов».

**Область применения:** итоги диссертации могут быть использованы в преподавательской деятельности, процессе дальнейшей научной разработки религиозного права, проблем свободы совести, истории конфессий, в работе государственных органов по оптимизации межконфессиональных отношений.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## ABSTRACT

**Grakhotski Alexander Pavlovich**

**Legal status of Russian Orthodox and Roman Catholic Churches in Belarus (1863–1905).**

**Key words:** legal status, Russian Orthodox Church, Roman Catholic Church, the Russian Empire, Belarusian territories, legislation, canon law, parish clergy, monasticism.

**Objectives:** to identify distinctive features, principle tendencies and rules of the legal status of Russian Orthodox Church and Roman catholic church in Belarus in 1863–1905.

**Methods:** the methodological basis of the research comprises the principles of objectiveness and historism. There have also been used general scientific methods (comparison, analysis, synthesis, induction and deduction); specific historical methods (genetic method, historical comparative method), specific judicial methods (judicial comparative method, judicial structural method, judicial systematic method, interpretation of legal norms).

**Results and their novelty:** for the first time in the historical and legal science a complex analysis of legal status of Russian Orthodox Church and Roman Catholic Church in Belarus in 1863–1905 was carried out, including analysis of a wide range of legislative acts that held the main provisions for the legal status of religious confessions in the Russian Empire, the characteristic of the model of relations between the state and the church provided by the author, revealing the tendencies which influenced the formation of the legal status of religious confessions, analysis of the administrative structure of churches, study of the legal status of Russian Orthodox and Roman Catholic clergy, analysis of the churches property status specific regulations, identification of the historical necessity of the choice made by Belarus in favor of currently existing model of relations between the state and religious confessions.

**Degree of use:** results of the study used in the learning process at the Faculty of Law in the Educational institution «Francisk Skorina Gomel State University» in teaching the course of lectures «History of State and Law of Belarus», «History of State and Law of the Slavic nations».

**Sphere of application:** the results of the thesis can be used in teaching, in the process the further scientific development of the religious law, the problems of freedom of conscience and history of confessions, in the work of government agencies to optimize interfaith relations.